*Аляксандр Карацееў*

# Сёння мы не на парадзе...





1

1. Рэпетыцыю з аркестравай групай праводзіць В. Талмачоў.
2. Аркестр пад кіраўніцтвам В. Талмачова на маршы.

«Музыка ў баявым страі» — так называўся заключны тур агляду-конкурсу вядучых духавых аркестраў БВА, прысвечанага 40-годдзю Вялікай Перамогі. Канцэрты, што адбыліся ў Мінскім Доме афіцэраў, з'явіліся творчай справаздачай ваенных музыкантаў. Выступленні лепшых аркестраў сабралі шмат слухачоў, сярод якіх былі не толькі спецыялісты і выканаўцы, але і сапраўдныя аматары духавой музыкі.

Конкурсныя выступленні былі святам і для саміх ваенных музыкантаў. Яны прыехалі з розных гарадоў рэспублікі і атрымалі магчымасць пазнаёміцца з новымі творамі, пачуць вядучых майстроў, паспаборнічаць з калегамі. Для кожнага з удзельнікаў агляд-конкурс стаў і адказным экзаменам. Вось што сказаў старшыня журы начальнік аркестравай службы БВА заслужаны артыст БССР Б. Чудакоў: «Лічу, што задачы агляду-конкурсу выкананы. Канцэрты паказалі, што сучасны стан аркестраў акругі — самы «баявы». Аркестры паспяхова выконваюць не толькі свае паўсядзённыя службовыя абавязкі, але і на высокім узроўні вядуць адказную работу па эстэтычнаму выхаванню як у воінскіх часцях, так і сярод працоўных рэспублікі».

Па ўмовах конкурсу ў праграму выступленняў уваходзілі класічныя творы, арыгінальныя кампазіцыі для духавых аркестраў, п'есы савецкіх, у тым ліку і беларускіх, кампазітараў. Зразумела, галоўнае месца ў рэпертуары займалі творы героіка-патрыятычнай тэматыкі, якія прагучалі пераканальна. Так, аркестр пад кіраўніцтвам Ф. Заўта выканаў Фантазію на тэмы песень пра Вялікую Айчынную вайну «За таго хлопца» В. Сураўцава і «Легенду пра Данка» Ю. Нахабіна, прысвечаную 80-годдзю рэвалюцыі 1905 года. Пранікнёна прагучалі знаёмыя мелодыі ў Фантазіі на тэмы песень Вялікай Айчыннай вайны Б. Дзіева і ў «Савецкай рапсодыі» В. Рунава. Гэтыя творы былі падрыхтаваны аркестрам пад кіраўніцтвам В. Кучына. Добрае ўражанне пакінула і выкананне В. Карчэўскім песні «Вясновыя сны» А. Гевіксмана ў суправаджэнні аркестра пад кіраўніцтвам Э. Варановіча.

Аналіз твораў героіка-патрыятычнай тэматыкі паказвае імкненне арыентавацца на песенныя творы з аркестравым суправаджэннем: такое выкананне спрыяе больш глыбокаму асэнсаванню твораў. У песні «Поле памяці» Л. Захлеўнага, напрыклад, курсант Г. Кулік і аркестр пад кіраўніцтвам В. Талмачова прадэманстравалі гарманічнае спалучэнне ўдалага выканання саліста і багатага суправаджэння аркестра — яскравыя кантрапункты, лагічныя сэнсавыя акцэнты, мяккае гучанне флейты і карнетаў, дакладны гукавы баланс у групе труб і кларнетаў з ужываннем сурдзін, патэтычнае туці. З вялікім пачуццём выканалі песню «Балада пра Чырвоны сцяг» А. Фельцмана В. Туромша і аркестр пад кіраўніцтвам Ю. Грыгор'ева. Саліст добра адчуў сэнс і змест песні, чысцінёй інтанацыі вызначыўся і аркестр. У кульмінацыйным туці знайшлося цікавае вырашэнне — трубачы і трамбаністы ігралі з узнятымі ўверх раструбамі.

Аднак найбольш удалай знаходкай было выкананне папуры «Сябры-аднапалчане» М. Вахуцінскага аркестрам пад кіраўніцтвам А. Ляшчынскага. Гэты твор у аркестравым варыянце часта даволі цяжкі для ўспрымання, хоць складаецца з шырокавядомых песенных тэм. Нават сам аўтар указваў, што ўсе мелодыі песень, з якіх складаецца папуры, могуць выконвацца самастойна. Многія аркестры звычайна або робяць купюры, або выконваюць мелодыі адразу на другія вольты рэпрызы. А. Ляшчынскі выбраў больш цікавы шлях: ён падрыхтаваў усе песні з салістамі ў суправаджэнні аркестра.

Тэматыка агляду-конкурсу вытлумачыла руплівы адбор і выкананне перш за ўсё твораў героіка-патрыятычнага гучання. Аднак аналіз канцэртных праграм паказвае, што рэпертуарная праблема ў дачыненні да духавых аркестраў не вырашана да канца. Як і раней, аркестры ахвотна звяртаюцца да класічных твораў, што ўплывае на рост выканаўчага майстэрства, узбагачае як музыкантаў, так і слухачоў. Напрыклад, аркестр В. Талмачова пазнаёміў з уверцюрай «Паэт і грамадзянін» аўстрыйскага кампазітара Франца Зупе, прадэманстраваўшы адзінае штрыхавое мысленне, высокі прафесіяналізм. Бездакорна выканаў аркестр В. Кучына уверцюру да оперы «Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава. Высокую культуру і мастацкі густ паказалі музыканты аркестра А. Носава пры выкананні Сімфанічнага танца опус 64 № 2 Грыга. Гучанне аркестра было мяккае і выразнае, яно набліжалася да сімфанічнага. Гэтыя прыклады паказваюць, што аркестры могуць дасягнуць добрых вынікаў толькі дзякуючы сур'ёзнаму падыходу і нястомным творчым пошукам. Асобна трэба сказаць пра аркестр Ф. Заўта, які выканаў Фантазію на тэмы оперы «Поргі і Бес» Гершвіна, а таксама «Вясеннія воды» С. Рахманінава. Гэты папулярны твор знаходзіцца ў рэпертуары многіх аркестраў, аднак для найбольш яскравага, урачыстага гучання гэтага гімна вясне кіраўнік абраў пералажэнне для ансамбля трубачоў у суправаджэнні аркестра.

Даволі часта мы сустракаемся з тым, што духавыя аркестры пазбягаюць выконваць «уласныя» творы, напісаныя спецыяльна для духавога аркестра, складаныя ў тэхнічных і мастацкіх адносінах. Аднак на конкурсе такія творы прагучалі. Так, аркестр А. Носава прадставіў «Гераічную уверцюру» Г. Сальнікава, якая прагучала манументальна і маштабна. Уразілі дзівосныя, палётныя сігналы труб, мяккасць гучання сярэдніх галасоў, драматычнасць кульмінацый.

Дакладную рэпертуарную пазіцыю займае і В. Талмачоў. Аркестр пад яго кіраўніцтвам выканаў рапсодыю «Брацтва па зброі» К. Гольдхамера. Аркестр бліскуча валодае сінкапіраваным рытмам, гнуткай меладычнай лініяй, дакладна выконвае спецыфічныя эстрадныя прыёмы. Аднак далёка не кожны твор такога плана ўсхваляваў слухачоў. Вельмі безасабова, нават абыякава выканалі Ю. Бялякоў і Ю. Зінчанка з аркестрам Ю. Грыгор'ева «Канцэртную польку для двух карнетаў» О. Хохуайта, твор цікавы, які дазваляе поўна раскрыць мастацкія магчымасці саліруючых інструментаў.

А вось выкананне уверцюры да оперы «Нямая з Порцічы» Абера, вядомай у нашай краіне як «Фенела», трэба назваць адкрыццём конкурсу. У гэтым творы Э. Варановіч здолеў разам з музыкантамі дасягнуць максімальнага раскрыцця пафасу рэвалюцыйна-вызваленчага руху. Гэтаму спрыялі бездакорнае гучанне, мяккасць і дынаміка ў труб, празрыстасць тэмбраў у драўляных духавых інструментаў, чысціня інтанацыі і баланс усіх груп аркестра.

Сапраўдным выпрабаваннем для кожнага калектыву з'яўляецца выступленне з салістам. Некаторыя памылкова лічаць, што праграма заўсёды пойдзе «на ўра», калі будзе запрошаны вядомы саліст. Сапраўды, калі музыканты ведаюць, што будуць выступаць поруч з славутым выканаўцам, яны рыхтуюцца да выступлення добрасумленна, што, на жаль, не заўсёды можна сказаць пра салістаў, якія часта разлічваюць толькі на свой аўтарытэт і вопыт. Але пры выступленні з духавым аркестрам гэтага недастаткова, бо трэба ведаць яшчэ і спецыфіку яго гучання.

Калі саліста-вакаліста слухачы ўспрымаюць як вядучага выканаўцу, а аркестр — толькі як акампанемент, дык саліст-інструменталіст з аркестрам успрымаецца куды больш арганічна. Таму многія аркестры ўскладалі на сваіх салістаў-інструменталістаў вялікія спадзяванні, спрабуючы за іх кошт скарацiць колькасць аркестравых твораў. Але, як правіла, салісты выбіраюць для выканання тыя творы, што ўжо добра знаёмыя кожнаму «духавіку». І некаторыя салісты прадсталі на конкурсе ў ненайлепшым выглядзе. Так, прагучаў славуты Канцэрт № 1 для кларнета з аркестрам Вебера (саліст Н. Каранчук) — і не пакінуў добрага ўражання. Няўдалым было і выкананне Канцэрціна для кларнета і аркестра Вебера (саліст С. Жалудок). А. Ляшчынскі павінен быў больш сур'ёзна

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

паставіцца і да твора, і да выканаўцы, бо ў саліста строй інструмента не супадаў са строем аркестра на працягу выканання ўсяго твора! Былі ў саліста і чыста тэхнічныя недапрацоўкі (пасажы ў хуткіх тэмпах). Цікава, чым можна растлумачыць факт, што недапрацаванае Канцэрціна калектыў усё-такі вырашыў паказаць публіцы і журы?

Аднак вернемся да праблемы рэпертуару для салістаў-інструменталістаў. Вырашыць яе можна ў тым выпадку, калі адшукаць цікавы, «незайграны» твор, які здолее выканаць саліст, што выразна і прадэманстраваў конкурс. У рэпертуары аркестра В. Кучына была «Лирическая плясовая» А. Гендалева для тубы — інструмента складанага ў тэхнічных адносінах (саліст Р. Платкоў). Незабыўныя ўражанні пакінула выкананне Н. Міневічам п'есы Эдзі Курта «Палісандр» для саліруючых ксілафона і вібрафона з аркестрам. Пранікнёна музыканты выканалі сярэднюю, лірычную частку, у якой здолелі дасягнуць празрыстасці гучання ў дзівосным спалучэнні тэмбраў вібрафона з драўлянымі духавымі інструментамі. Кіраўнік Э. Варановіч улічыў і магчымасці саліста, і багатае тэмбравае спалучэнне інструментаў, якія рэдка ўжываюцца як сольныя, з аркестравымі групамі.

Так, задача кожнага аркестра ў тым, каб знайсці адзін, але не абы-які твор для саліста з аркестрам, які па-сапраўднаму ўпрыгожыць усю праграму. І тут паўстае новая праблема: неабходнасць адбору твораў для пабудовы канцэртнай праграмы па законах музычнай драматургіі. Адзін удала знойдзены твор не дапаможа вырашыць гэтую задачу, што і паказаў конкурс ваенных музыкантаў. Добрае майстэрства прадэманстраваў А. Носаў са сваім аркестрам у маштабнай «Святочнай уверцюры» А. Маруцяна. Але яна «выпала» і з агульнай тэматыкі конкурснай праграмы, і з кампазіцыі выступлення аркестра, таму што побач з гэтым творам, які захапіў усіх сваім тэмпераментам, спецыфічным каларытам, астатнія нумары прагучалі бледна. Ці іншы прыклад: калі аркестры Э. Варановіча, В. Талмачова, Ф. Заўта, А. Носава паказалі цэласныя конкурсныя праграмы, дык аркестр Ю. Грыгор'ева не апраўдаў спадзяванняў. Гэты калектыў выканаў толькі два аркестравыя творы, а ў чатырох суправаджаў салістаў. Адзначу, што п'ес для салістаў было зашмат, пры гэтым выконваліся яны адна за адной, таму нават падрыхтаваным слухачам успрымаць гэта было цяжка. Не па сіле была праграма і самім музыкантам. Так, у Канцэрце для валторны з аркестрам Моцарта (частка першая, саліст Э. Змачынскі) аркестр іграў з выдатным адчуваннем стылю і характару музыкі, у той час як саліст значна прайграваў у майстэрстве калектыву. Сольная партыя гучала цьмяна, славутыя моцартаўскія трэлі выконваліся неахайна.

Аркестравае выкананне з салістам патрабуе куды большай увагі, з'асароджанасці, чым выступленне ў чыста аркестравым рэпертуары. Ю. Грыгор'еў не паклапаціўся, каб зрабіць праграму выступлення больш разнастайнай, у



2

выніку чаго музыканты не здолелі пераканальна падтрымаць саліста А. Грыгаровіча ў эстраднай п'есе «Мой сябра кларнетыст» Б. Карамышава, хоць выканаўца выступіў вельмі ўпэўнена.

Такім чынам, рэпертуарныя пытанні патрабуюць яшчэ шмат увагі з боку дырыжораў духавых аркестраў, хоць вырашыць іх, безумоўна, можна. У нас ёсць шмат добрых інструментоўшчыкаў, музыкантаў, што пішуць для аркестра і ведаюць прыроду духавой музыкі. Так, дзякуючы этузіязму В. Талмачова і музыкантаў яго аркестра на конкурсе адбылася прэм'ера «Фестывальнага марша», які напісаны артыстам аркестра Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР Г. Уласюком (кларнет). Гэта — цікавы твор, які захоплівае выразнай мелодыяй, сучасным гучаннем, добрым веданнем тэхнічных і мастацкіх магчымасцей усіх інструментаў, самой інструментоўкі для духавога аркестра. Такі твор, безумоўна, упрыгожыць выступленне кожнага калектыву.

Працягваючы гаворку пра нескарыстаныя рэзервы, хочацца адзначыць, што на падобных конкурсах мэтазгодна было б вызначаць не толькі выканаўчы ўзровень аркестраў, але і лепшыя, у тым ліку і дырыжорскія, інструментоўкі.

Варта адзначыць, што на конкурсе гучала шмат беларускай музыкі. Выконваліся Фантазія на тэмы песень пра Беларусь (аркестр В. Талмачова), Фантазія на беларускія тэмы А. Куніна і «Цыганскі танец» з балета «Падстаўная нявеста» Г. Вагнера, у якім удала спалучаліся лірычныя эпізоды ў драўляных духавых з тэмпераментам цыганскага танца ў туці (аркестр Э. Варановіча), «Беларуская мазаіка» Э. Казачкова з яскравай, рэльефнай меладычнай лініяй (аркестр А. Носава). Тэмпераментам вызначыліся мелодыі «Лявоніхі», «Полькі», з асаблівай цеплынёй выконвалася «Перапёлачка» з пяшчотным сольным правядзеннем флейты і кларнетаў у «Беларускай рапсодыі» В. Кнушавіцкага (аркестр А. Ляшчынскага). Улічваючы тое, што выступалі ваенныя музыканты, стан беларускага рэпертуару можа толькі радаваць.

Асоба кіраўніка ў дзейнасці аркестра іграе вырашальную ролю. Там, дзе ёсць высокі прафесіяналізм, ініцыятыва і зацікаўленасць у любімай справе, добрых вынікаў чакаць доўга не трэба. «На заключным туры агляду-конкурсу выступілі лепшыя аркестры БВА,— адзначыў Б. Чудакоў,— якія ўзначальваюць вопытныя музыканты. Кожны з гэтых калектываў мае ўласны твар, таму вызначыць пераможцаў было нялёгка. Па выніках конкурсу лаўрэатам стаў аркестр В. Талмачова, дыплом II ступені атрымаў аркестр Ф. Заўта, III ступені — аркестры А. Носава і Э. Варановіча. Журы адзначыла таксама аркестры А. Ляшчынскага, В. Кучына і Ю. Грыгор'ева».

На заканчэнне агляду-конкурсу адбыўся канцэрт, у якім удзельнічалі лепшыя аркестры. На жаль, амаль усе яны выканалі творы, што ўжо гучалі на папярэдніх канцэртах. Аднак заключны канцэрт даваў магчымасць калектывам прадэманстраваць і «адвольную праграму», шырыню творчых інтарэсаў. Трэба сказаць, што конкурсныя творы прагучалі на гэты раз горш. І справа нават не ў тым, што яны былі «на слыху». Думаецца, сваё слова сказала стомленасць музыкантаў. Бадай адзіным калектывам, які зноў скарыў слухачоў майстэрствам і паказаў новыя творы, быў аркестр Ф. Заўта. Выдатна быў выкананы «Парад трубачоў» Д. Кроціла і канцэртная п'еса для ансамбля кларнетаў і аркестра М. Кажлаева. Апошні твор быў цікавы яшчэ і тым, што на конкурсе ансамблі практычна не былі прадстаўлены, за выключэннем хіба што ансамбля трубачоў гэтага ж аркестра.

У другім аддзяленні канцэрта выступіў лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, лаўрэат усесаюзных конкурсаў аркестр штаба БВА, які ў дні правядзення конкурсу адзначыў сваё 35-годдзе. Прагучала шмат папулярных твораў, якія выконваюць усе духавыя аркестры. Але асаблівае ўражанне пакінуў твор «Над хвалямі» Ю. Розаса. Аркестр выканаў яго ў сапраўдным канцэртным гучанні, уразіў высокім майстэрствам салістаў, багатай інструментоўкай.

Яскравым фінальным акордам агляду-конкурсу, які стаў значнай падзеяй у культурным жыцці рэспублікі, з'явілася свята ваеннай духавой музыкі «Армейскія трубы гучаць».